негатывізацыі.

Што ж з'яўлялася эмацыйна-псіхалагічнай асновай дадзенага стэрэатыпа? Пра гэта вельмі выразна сказаў Я. Купала ў сваім вершы «А хто там ідзе?». Рухала імі – «пагарджанымі, сляпымі і глухімі» – крыўда і жаданне «называцца людзьмі» [10].

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. *Ольшанский, Д.* Основы политической психологии / Д. Ольшанский. – Екатеринбург: Деловая книга, 2001. – 496 с.
2. *Айтбаев, А. А.* Феномен национального менталитета / А. А. Айтабаев // Актуальные проблемы гуманитарных и естественных наук. – 2016. – № 7–2. – С. 180–183.
3. *Bardach, J.* Wieloszczeblowa świadomość narodowa na ziemiach litewsko-ruskich Rzeczypospolitej w XVII–XX / J. Bardach / Krajowość – tradycje zgody narodów w dobie nacjonaliymu. – Poznań: Instytut Historii UAM, 1999. – S. 11–34 / Odbitka z zbióru: Materiały z międzynarodowej konferencji naukowej w Instytucie Historii UAM w Poznaniu (11–12 maja 1998).
4. Прамова Мялешкі // Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI – першая палова XVIII стагоддзя / НАН Беларусі, Ін-т літ. імя Я. Купалы; Падрыхтаваў А. І. Богдан [і інш.] / навук. рэд. В. А. Чамярыцкі. – Мінск: Беларуская навука, 2003. – С. 674–677.
5. *Сержпутоўскі, А. К.* Дваранін // Казкі і апавяданні беларусаў-палешукоў / А. К. Сержпутоўскі. – Мінск: Універсітэцкае, 1999. – С. 148–149.
6. *Дунін-Марцінкевіч, В.* Пінская шляхта / В. Дунін-Марцінкевіч // Выбраныя творы. – Мінск: Дзяржаўнае вучэб.-пед. выд-ва М-ва асветы БССР, 1957. – С. 48–68.
7. *Хатеев, Алексий свящ.* Полоцкий собор 1839 года / свящ. Алексий Хатеев // Сайт прихода иноны Всей скорбящих Радость – Режим доступа: http://www.sobor.by/sobor1839.php. – Дата доступа: 24.01.2019.
8. *Кротов, А. М.* Реакция белорусского обывателя на польское национально-освободительное движение на белорусских землях в XIX веке / А. М. Кротов // Беларусь у XIX–XXI стагоддзях: праблемы этнакультурнага і нацыянальна-дзяржаўнага развіцця: зб. навук. арт. / ГДУ імя Ф.Скарыны. – Гомель: ГДУ імя Ф. Скарыны, 2013. – С. 17–26.
9. *Чернявская, Ю.* Белорусы. От «тутэйшых» – к нации / Ю. Чернявская. – Минск: ФУАинформ, 2010. – 512 с.
10. *Купала, Я.* А хто там ідзе? / Я. Купала // Вершы беларускіх паэтаў. Нацыянальны паэтычны партал [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://vershy.ru/content/khto-tam-idze. – Дата доступу: 29.01.2019.


**(Дата падачы: 6.02.2019 г.)**

*С. В. Кузьміч*
Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск
*S. Kuzmich*
Belarusian State University, Minsk

**УДК 93/94**

# СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ ДЫПЛАМАТЫЧНЫХ АДНОСІН РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПАСЛЯ АТРЫМАННЯ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ (1991–1996 ГГ.)

# THE ESTABLISHMENT AND DEVELOPMENT OF DIPLOMATIC RELATIONS OF THE REPUBLIC OF BELARUS AFTER INDEPENDENCE (1991–1996)

*У артыкуле разглядаецца дзейнасць дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусь па ўсталяванню і развіццю дыпламатычных адносін з краінамі свету пасля атрымання незалежнасці. Асобая ўвага надаецца аналізу дзейнасці Міністэрства замежных спраў.*

*Ключавыя словы: амбасады; дыпламатычныя адносіны; знешняя палітыка; консульствы; міжнародныя адносіны; Міністэрства замежных спраў.*

*The article deals with the activities of the state power of the Republic of Belarus to establish and develop diplomatic relations with the countries of the world after independence. Special attention is directed to the activities of the Ministry of foreign Affairs.*

*Key words: embassies; diplomatic relations; foreign policy; consulates; international relations; Ministry of foreign Affairs.*

Пачаткам фарміравання незалежнай знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь варта лічыць падпісанне Белавежскіх пагадненняў 8 снежня 1991 года. Менавіта з гэтага часу пачаўся перыяд міжнароднага прызнання нашай краіны як самастойнага паўнапраўнага міжнароднага суб’екта.

Як адзначае беларускі гісторык Уладзімір Снапкоўскі, асноўнымі задачамі для дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусь у адзначаны перыяд з’яўлялася «ўмацаванне рэальнага суверэнітэту і незалежнасці, супрацоўніцтва з дзяржавамі СНД у “арганізацыі” постсавецкай прасторы, наладжванне адносін з суседнімі краінамі, пераўтварэнне Беларусі ў бяз’ядзерную і нейтральную дзяржаву, “вяртанне ў Еўропу” і развіццё сувязей з дзяржавамі Захаду» [7].

На працягу 1991–1992 гг. незалежнасць Беларусі была цалкам дэюрэ прызнаная міжнароднай супольнасцю. У першую чаргу Беларусь была зацікаўлена ў міжнародна-прававым прызнанні з боку Расіі, ЗША, асноўных заходнееўрапейскіх дзяржаў, а таксама Японіі. Калі Расія вызывала зацікаўленасць як найбуйнейшая крыніца сыравіны і адначасова асноўны рынак збыту для беларускіх тавараў, то ўваходжанне Беларусі ў еўрапейскую цывілізацыйную прастору азначала інтэграцыю ў сусветную супольнасць. Што тычыцца Японіі, то патрэбна адзначыць, што яна аказвала значную гуманітарную і кансультацыйна-тэхнічную дапамогу па Чарнобыльскаму пытанню. Першымі дзяржавамі за межамі СНД, якія прызналі суверэнітэт Беларусі, з’яўляліся: Турцыя (16 снежня 1991 г.), Швецыя (19 снежня 1991 г.), Манголія (20 снежня 1991 г.). 27 снежня 1991 г. суверэнітэт Беларусі быў прызнаны ЗША. Адной з прычын хуткага прызнання суверэнітэту Рэспублікі Беларусь суседнімі краінамі з’яўлялася адсутнасць тэрытарыяльных прэтэнзій. З Расіяй, Украінай, Польшчай, Латвіяй і Літвой былі падпісаны палітычныя дагаворы і дагаворы аб дзяржаўнай мяжы, якія замацавалі тэрытарыяльны статус-кво.

Да канца 1991 г. Беларусь была прызнана 54 дзяржавамі свету, дзве з якіх (ЗША і Украіна) усталявалі з Рэспублікай Беларусь дыпламатыч-

ныя адносіны. 23 снежня 1991 г. рашэнне аб прызнанні суверэнітэту былых рэспублік СССР было прынята кіраўнікамі краін-членаў ЕС падчас сустрэчы ў г. Гаага. Прызнанне Беларусі заходнееўрапейскімі дзяржавамі практычна завяршылася ў лютым 1992 г. (за выключэннем Люксембурга (9 ліпеня 1992), Ватыкана (11 лістапада 1992 г.) і Партугаліі (7 снежня 1992 г.)).

Міжнародна-прававое прызнанне Беларусі не заўсёды ішло паралельна з усталяваннем дыпламатычных адносін. З 129 дзяржаў, якія прызналі Рэспубліку Беларусь у перыяд 1991–1994 гг., дыпламатычныя адносіны з беларускай дзяржавай усталявалі толькі 102 краіны. Асноўнымі формамі ўстанаўлення дыпламатычных адносін з'яўлялася подпісанне адпаведнага пагаднення, або Пратаколу, у ходзе візітаў у краіну кіраўнікоў замежных знешнепалітычных ведамстваў і міністра замежных спраў Беларусі. З некаторымі дзяржавамі дыпламатычныя адносіны былі ўсталяваныя праз абмен дыпламатычнымі нотамі [2].

У гэты перыяд у якасці адной з найважнейшых задач для беларускай дыпламатыі на практычным узроўні было вызначана развіццё шматбаковага і двухбаковага супрацоўніцтва з рознымі дзяржавамі свету [10]. Для рэалізацыі сваіх палітычных і эканамічных інтарэсаў на міжнароднай арэне Беларусі неабходна было сфарміраваць цэнтралізаваную сістэму дыпламатычных і консульскіх установаў за мяжой.

Міністэрства замежных спраў заклікала максімальна засяродзіцца на адкрыцці ўласных замежных установаў ва ўмовах дэфіцыту валютных рэсурсаў. Прапаноўвалася арыентавацца на адкрыццё двух відаў дыппрадстаўніцтваў: дыпламатычных (у абмежаваным ліку краін) і консульскіх (ва ўсіх выпадках, калі гэтага запатрабуюць эканамічныя інтарэсы краіны). Такі падыход, акрамя іншага, дазваляў скарыстацца прывілеямі, ільготамі і імунітэтамі, прадугледжанымі міжнароднымі нормамі для такіх прадстаўніцтваў, іх супрацоўнікаў і членаў сем'яў у месцах іх знаходжання.

Для таго, каб у поўным аб'ёме ўлічваць увесь спектр інтарэсаў Беларусі за мяжой, прапаноўвалася прадугледзець у замежных прадстаўніцтвах пасады падвойнага падпарадкавання: консульскаму кіраванню МЗС і дыпламатычным прадстаўнікам Рэспублікі Беларусь у краінах знаходжання. Фінансаванне дзейнасці беларускіх замежных прадстаўніцтваў прапаноўвалася ажыццяўляць цэнтралізавана за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту і зацікаўленых ведамстваў і прадпрыемстваў.

Дзяржкамітэт па знешнеэканамічных сувязях адстойваў неабходнасць захавання інстытута гандлёвых прадстаўніцтваў, як асноўных вядучых замежных установаў краіны. Адзначалася, што практыка ўтрымання такіх абасобленых структур эканамічна сябе апраўдвае.

У асобных дзяржавах гандлёва-эканамічную службу, у тым ліку з вылучэннем у асобную структуру пры паспяховым развіцці эканамічнага

ўзаемадзеяння, прапаноўвалася арганізаваць у пасольствах, у якіх павінны былі працаваць гандлёвыя дарадцы [6].

У 1992–1993 гг. адбылося адкрыццё першых пасольстваў Рэспублікі Беларусь за мяжой – у Польшчы, ФРГ, ЗША, Ізраілі, КНР, Літве, Латвіі, Расіі, Украіне. Прадстаўніцтвы Рэспублікі Беларусь пры міжнародных арганізацыях у Францыі, Аўстрыі і Швейцарыі таксама былі ператорваныя ў пасольствы. У гэты ж перыяд пачалося станаўленне консульскай службы. У сваю чаргу замежныя дзяржавы на працягу 1992 г. адкрылі 11 пасольстваў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь [2].

Дзякуючы актыўнаму развіццю афіцыйных кантактаў на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў, міністраў замежных спраў з Расіяй, ЗША, Вялікабрытаніяй, Германіяй, Італіяй, Нарвегіяй, Даніяй, Нідэрландамі, Швецыяй, Фінляндыяй, Грэцыяй, Іспаніяй, Швейцарыяй, Турцыяй, Кіпрам і г. д., Рэспубліка Беларусь змагла за кароткі адрэзак часу ўсталяваць з гэтымі краінамі міждзяржаўныя сувязі па розных кірунках [4]. Так, падчас сустрэчы ў лістападзе 1991 г. міністра замежных спраў П. Краўчанкі з намеснікам памочніка дзяржаўнага сакратара ЗША К. Кэнанам, амерыканскаму боку было прапанавана ўсталяваць з Беларуссю прамыя адносіны і абмяняцца консульствамі і гандлёвымі прадстаўніцтвамі. У ліпені 1993 г. і студзені 1994 г. старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь С. Шушкевіч і прэзідэнт ЗША Б. Клінтан абмяняліся ўзаемнымі візітамі ў Вашынгтон і Мінск. У красавіку 1994 г. Беларусь з трохдзённым візітам наведаў Генеральны сакратар ААН Б. Бутрас Галі [3]. У сакавіку 1992 г. адбыўся візіт ў Рэспубліку Беларусь намесніка федэральнага канцлера, міністра замежных спраў ФРГ Г.-Д. Геншара, па выніку якога было падпісана пагадненне аб аднаўленні дыпламатычных адносін [2].

Значны ўклад у развіццё міжнародных адносін Беларусі ўнёс тагачасны Міністр замежных спраў Беларусі П. Краўчанка. У прыватнасці, ён прапаноўваў ініцыятыву «Мінск – Усходні Брусэль», якая прадугледжвала пераўтварэнне Мінска ў цэнтр інтэграцыйных працэсаў у СНД з мэтай будаўніцтва ў перспектыве Усходне-Еўрапейскай Эканамічнай Садружнасці. Пасля гэтай ініцыятывы многія беларускія палітыкі і эксперты загаварылі пра тое, што Беларусь з’яўляецца мастом паміж Еўропай і Азіяй. Аднак большасць беларускага грамадства, у тым ліку старшыня Вярхоўнага Савету С. Шушкевіч, успрынялі дадзеную канцэпцыю скептычна, найперш гэта было звязана з нізкай ініцыятыўнасцю і высокай ступенню цярпімасці беларусаў у выбары палітычных і сацыяльна-эканамічных прыярытэтаў [1, с. 564].

Міністр замежных спраў сфармуляваў 8 асноўных прыярытэтаў знешняй палітыкі Беларусі: дасягненне Беларуссю рэальнай незалежнасці і суверэнітэту; узаемадзеянне з іншымі былымі рэспублікамі СССР у стварэнні адзінай эканамічнай прасторы і новага саюза суверэнных дзяржаў; мабілізацыя міжнароднай падтрымкі ў вырашэнні чарнобыльскай

праблемы; ператварэнне Беларусі ў бяз'ядзерную і нейтральную дзяржаву; уключэнне Беларусі ў агульнаеўрапейскі працэс; стварэнне ўмоў для фарміравання рыначнай эканомікі; забеспячэнне экалагічнай бяспекі; забеспячэнне свабоднага ўзаемадзеяння культур [8].

Дзякуючы дзейнасці дзяржаўнай улады, асабліва МЗС, перыяд парламенцкай формы кіравання (1991–1994 гг.) увайшоў у гісторыю як перыд міжнароднага прызнання Рэспублікі Беларусь краінамі свету. За кароткі адрэзак часу была сфарміравана цэнтралізаваная сістэма дыпламатычных і консульскіх устаноў як за мяжой, так і на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з боку іншых краін свету.

Пасля абрання ў ліпені 1994 г. прэзідэнтам краіны А. Лукашэнка пачаўся новы этап у гісторыі суверэннай Беларусі і яе знешняй палітыкі. Істотныя змены адбыліся ў знешнепалітычнай дактрыне, механізме распрацоўкі і рэалізацыі знешняй палітыкі беларускай дзяржавы. А. Лукашэнка сфармуляваў наступныя знешнепалітычныя прыярытэты Беларусі: умацаванне суверэнітэту краіны; узмацненне шматбаковага і двухбаковага супрацоўніцтва з дзяржавамі СНД пры акцэнтаванні сувязей з Расіяй; развіццё адносін з краінамі Захаду, у тым ліку з краінамі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы; стварэнне спрыяльных перадумоў для супрацоўніцтва з міжнароднымі арганізацыямі.

Але галоўным вектарам знешняй палітыкі стала Расія. У канцы 1990-х гг. перакос усходняга вектара аказаўся настолькі моцным і відавочным, што беларускі прэзідэнт абвясціў курс на шматвектарную знешнюю палітыку. У пэўнай ступені гэта праявілася ў актывізацыі сувязей з краінамі Азіі і Паўночнай Афрыкі [8].

У распрацаваным пасля прэзідэнцкіх выбараў дакуменце «Асноўныя напрамкі знешнепалітычнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь» гаварылася аб тым, што Беларусь будзе будаваць шматузроўневую сістэму прыярытэтаў і двухбаковых адносін. Галоўнымі напрамкамі вызначаліся адносіны с Расіяй, затым Украінай, Польшчай, краінамі Прыбалтыкі. На еўрапейскім напрамку вызначаліся 4 узроўні: 1) Германія, Венгрыя, Чэхія, Славакія, Балгарыя, Румынія; 2) Аўстрыя, Рэспублікі Югаславіі, Скандынаўскія дзяржавы; 3) Партугалія, Швецыя, сярэднеразвітыя дзяржавы Еўропы; 4) эканамічна высокаразвітыя дзяржавы Еўропы. Асобным напрамкам з'яўляліся адносіны з США, Кітаем, Індыяй [10]. У 1994–1996 гг. былі адкрыты пасольствы Рэспублікі Беларусь у Балгарыі, Бельгіі, Вялікабрытаніі, Паўночная Ірландыіі, Узбекістане, Чэхіі, Малдове, Румыніі, Японіі, Італіі, Нідэрландах, Саюзнай Рэспубліцы Югаславіі [9].

Патрэбна адзначыць, што поспехі ў эффектыўным развіцці дыпламатычных адносін таксама былі забяспечаны за кошт удасканалення нарматыўнаправавой базы. Згодна з Пастанаўленнем Савета Міністраў БССР № 342 ад 4 верасня 1991 г. на Міністэрства замежных спраў ускладвалася адказнасць за ажыцяўленне знешняй палітыкі. У 1995 г. Прэзідэнт падпісаў Указ

«Аб зацвярджэнні Палажэння аб дыпламатычнай службе Рэспублікі Беларусь», які ўпершыню зафіксаваў асноўныя прынцыпы функцыянавання і структуру дыпламатычнай службы. Дыпламатычная служба Рэспублікі Беларусь вызначалася як від службы ў дзяржаўным апараце. Яна ажыццяўлялася ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Законам Рэспублікі Беларусь «Аб асновах службы ў дзяржаўным апараце», Палажэннем «Аб Міністэрстве замежных спраў Рэспублікі Беларусь» і іншымі нарматыўна-прававымі актамі. Сістэму дыпламатычнай службы Рэспублікі Беларусь складалі Міністэрства замежных спраў, дыпламатычныя прадстаўніцтвы і консульскія ўстановы Рэспублікі Беларусь за мяжой [11].

У палажэнні былі вызначаны правы і абавязкі дыпламатычных работнікаў, парадак прызначэння паслоў і пастаянных прадстаўнікоў пры міжнародных арганізацыях, сістэма дыпламатычных рангаў.

У сувязі з пашырэннем сеткі дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў за мяжой, у 1996 г. таксама быў падпісаны Указ «Аб зацвярджэнні Палажэння аб дыпламатычных прадстаўніцтвах і консульскіх установах Рэспублікі Беларусь» [12].

Структура цэнтральнага апарата МЗС за 1991–1996 гг. каардынальна змянілася. Былі створаны тэрытарыяльныя і шэраг новых функцыянальных падраздзяленняў: па працы з замежнымі ўстановамі, па пытаннях гуманітарнага супрацоўніцтва, па праблемах наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, дагаворна-прававы аддзел і інш. Былі ператвораныя і пашыраны многія падраздзяленні міністэрства, значна вырасла колькасць супрацоўнікаў цэнтральнага апарата. На момант абвяшчэння ў 1990 годзе Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце ў МЗС БССР працавала 46 чалавек (з іх 34 – дыпламатычныя супрацоўнікі), да канца 1992 года іх колькасць павялічылася да 150 чалавек.

Дзякуючы станаўленню эфектыўнай дыпламатычнай службы, Рэспубліка Беларусь дасягнула прыкметных поспехаў у развіцці знешнепалітычных адносін с рознымі краінамі свету. Структура МЗС, яго функцыі, асноўныя формы і метады дзейнасці адпавядалі мэтам і задачам знешнепалітычнага курсу беларускай дзяржавы. У Рэспубліцы Беларусь былі створаны ўсе ўмовы для падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў у дыпламатычнай сферы. За адносна невялікі тэрмін Рэспубліка Беларусь змагла стварыць шырокую сетку дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў за мяжой [6].

Падводзячы вынік, патрэбна адзначыць, что суверынітэт і незалежнасць з’яўляюцца галоўнай каштоўнасцю для любой краіны і яе народа. Але, як паказвае гісторыя, для эффектыўнага развіцця гэтага не дастаткова. Акрамя незалежнасці для любой дзяржавы з’яўляецца вельмі важным атрыманне міжнароднага прызнання і ўсталяванне з краінымі свету дыпламатычных адносін. Атрымаўшы незалежнасць, Рэспубліка Беларусь за кароткі перыяд часу была прызнана як самостойны міжнародны суб’ект. Паспяховае ўсталяванне дыпламатычных адносін з рознымі краінамі свету спры-

яла палітычнаму, сацыяльна-эканамічнаму і культурнаму развіццю нашай краіны.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ў канцы XVIII – пачатку XXI ст.: у 2 кн. / М. У. Смяховіч [і інш.]; рэдкал.: А. А. Каваленя [і інш.]; Нац. акадэм. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Беларус. навука, 2012. – Кн. 2. – 640 с.

2. *Камышев, К. В.* Международное признание Республики Беларусь / К. В. Камышев // Журнал международного права и международных отношений. – 2005. – № 1. – С. 30–39.

3. *Кузьмич, С. В.* Установление международных связей Республики Беларусь с Соединенными Штатами Америки (1991–1996 гг.) / С. В. Кузьмич // Актуальные проблемы социально-гуманитарного знания: материалы II Междунар. студ. науч.-теорет. конф., Минск, 18 апр. 2017 г. / Бел. гос. пед. ун-т им. М. Танка; редкол.: А. В. Касович [и др.]. – Минск: РИВШ, 2017. – С. 82–83.

4. *Кузьмич, С. В.* Деятельность государственной власти Республики Беларусь в становлении международных отношений со странами Запада в период парламентской формы правления (1991–1994 гг.) / С. В. Кузьмич // Сб. науч. трудов. – Минск: РИВШ, 2017. – Вып. 17: Исторические и психолого-педагогические науки. – С. 218–224.

5. *Кузьміч, С. В.* Уплыў геапалітычнага становішча на знешнепалітычную дзейнасць дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусь (1991–1994 гг.) / С. В. Кузьміч // Белорусская государственность: истоки, становление, развитие (IX–XXI вв.): материалы Респуб. науч.- теорет. конф., Минск, 29 июн. 2017 г. / Бел. гос. пед. ун-т им. М. Танка; редкол.: А. В. Касович [и др.]. – Минск: РИВШ, 2017. – С. 126–128.

6. *Лазоркина, О. И.* Становление и развитие дипломатической службы Беларуси / О.И. Лазоркина // Журнал международного права и международных отношений. – 2014. – № 1. – С. 27–31.

7. *Снапковский, В. Е.* Беларуская дзяржаўнасць і дыпламатыя ў XX ст. / Е. В. Снапковский // Журнал международного права и международных отношений. – 2001. – № 1. – С. 46–50.

8. *Снапковский, В. Е.* Внешняя политика Республики Беларусь: первые итоги первого десятилетия / Е. В. Снапковский // Журнал международного права и международных отношений. – 2000. – № 4. – С. 42–49.

9. *Тихомиров, А. В.* Дипломатия Республики Беларусь: становление и современное состояние / А. В. Тихомиров // Дипломатия Беларуси: прошлое и настоящее: материалы научного семинара, Минск, 23 марта 2017 г. / БГУ, Факультет международных отношений; Общественное объединение «Центр изучения внешней политики и безопасности»;

редкол.: В. Г. Шадурский [и др.]. – Минск: БГУ, 2017.– С. 37–41.
10. *Шадурскі, В. Г.* Фарміраванне канцэптуальных асноў знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь (1991–2011) / В. Г. Шадурскі // Весн. БДУ. Сер. 3, Гісторыя. – 2011. – № 3. – С. 31–36.
11. Аб зацвярджэнні Палажэння аб дыпламатычнай службе Рэспублікі Беларусь: Указ прэзідэнта Рэсп. Беларусь от 6 апр. 1995 г. № 142 // Кансультант Плюс: Беларусь. Тэхналогія 300 [Электронны рэсурс] / ООО «ЮрСпектр». – Мінск, 2019.
12. Аб зацвярджэнні Палажэння аб дыпламатычных прадстаўніцтвах і консульскіх установах Рэспублікі Беларусь: Указ прэзідэнта Рэсп. Беларусь от 9 ліп. 1996 г. № 247 // Кансультант Плюс: Беларусь. Тэхналогія 300 [Электронны рэсурс] / ООО «ЮрСпектр». – Мінск, 2019.

**(Дата подачи: 27.02.2019 г.)**

*С. В. Кулинок*
Национальный архив Республики Беларуси, Минск
*S.V. Kulinok*
The National Archives of the Republic of Belarus, Minsk

**УДК 355.486:356.15(476)“1941/1942”**

## БОРЬБА С НЕМЕЦКОЙ АГЕНТУРОЙ В ТЫЛУ СОВЕТСКИХ ВОЙСК И В ПАРТИЗАНСКИХ ОТРЯДАХ НА ТЕРРИТОРИИ БЕЛАРУСИ (ИЮНЬ 1941 – АПРЕЛЬ 1942 Г.)

## THE FIGHT AGAINST THE GERMAN AGENTS IN THE REAR OF SOVIET TROOPS AND THE PARTISAN MOVEMENT IN BELARUS (JUNE 1941 – APRIL 1942)

*В статье рассматривается деятельность органов партизанской контрразведки и спецгрупп НКВД/НКГБ по выявлению и разоблачению немецкой агентуры в первые месяцы войны. Анализируются основные формы и методы ее подготовки и заброски в формирования «лесных солдат». Делается вывод о том, что контрразведывательная служба партизан в начальный период войны столкнулась со значительными трудностями и далеко не всегда немецкая агентура разоблачалась своевременно. Вместе с этим, отметим постепенное улучшение качества работы контрразведчиков, что было обусловлено централизацией партизанского движения, постепенных организационным оформлением структуры и органов контрразведки, а также помощью советских органов госбезопасности.*

*Ключевые слова: агент, Великая Отечественная война, вербовка, разведывательно-диверсионная школа, шпионаж.*

*The article discusses the activities of partisan counterintelligence agencies and special groups of the NKVD/NKGB to identify and expose German agents in the first months of the war. The main forms and methods of its preparation and throwing in the formation of "forest soldiers" are analyzed. It is concluded that the guerrilla counter-intelligence service in the initial period of the war faced considerable difficulties and it was far from always that the German agents exposed themselves in a timely manner. At the same time gradual improvement in the quality of work of counterintelligence noted, which was due to the centralization of the partisan movement, the gradual organizational design of the structure and counterintelligence agencies, as well as*